

76. *Помнік віцебскім падпольшчыкам.*

ссунутым адносна вертыкальнай восі. У блоку гарэльефная выява твораў юнака і дзяўчыны. Абагульнена трактаваная пластыка твораў перадае збіральныя вобразы гераічных змагароў падполля. На стэле — памятны надпіс.

Літ.: Пахомов Н. И., Дорофеенко Н. И., Дорофеенко Н. В. Витебское подполье.— 2 изд.— Мн., 1974.

М. У. Дарафеенка, Л. Г. Лапцэвіч.

77. ПОМНІК ВУЧНЯМ (гіст.). Вул. Камсамольская, 23, у двары сярэдняй школы № 9. У 1968 г. на ўшанаванне памяці 3 вучняў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, пастаўлена стэла.

78. ПОМНІК ГЕРОЯМ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ 1812 г. (гіст., архіт.). На вул. Савецкай. Пабудаваны ў 1911—12 гг. (арх. І. А. Фамін), адкрыты 6.12. 1912 г. Будаўнічымі работамі кіраваў віцебскі гарадскі архітэктар Ц. В. Кібардзін.

У Айчынную вайну 1812 г. недалёка ад Віцебска каля вёсак Астроўна і Кукавячына 13—14 ліпеня адбыліся баі рускіх войск пад камандаваннем генералаў А. І. Остэрмана-Талстога і П. П. Канаўніцына з французскімі войскамі пад камандаваннем генерала І. Мюрата. Пасля гэтых баёў 1-я руская армія пакінула Віцебск і рушыла ў напрамку Смаленска на злучэнне з 2-й арміяй. Для прыкрыцця адыходу галоўных сіл быў пакінуты ар'ергардны атрад. Упартыя баі каля вёсак Дабрэйкі і Цялятнікі не сціхалі 15 ліпеня амаль увесь дзень.

У Расіі армія Напалеона была разгромлена. 26.10.1812 г. рускія войскі пад камандаваннем П. Х. Вітгенштэйна вызвалілі Віцебск.

На ўшанаванне памяці рускіх воінаў, якія ў баях пад Віцебскам 13—15.7 і 26.10.1812 г. праявілі мужнасць і стойкасць у барацьбе з захопнікамі, пастаўлены помнік. Уяўляе сабой чатырохгранны суцэльны абеліск з чырвонага граніту вышынёй 26 м, пастаўлены на часткова расчлянёны прамавугольны п'едэстал і завершаны двухгаловым арлом на шары. Абеліск ад п'едэстала аддзяляюць 4 маленькія вуглавыя блокі з прасветамі паміж імі. На вертыкальнай плоскасці п'едэстала — пліта з надпісам. Па вуглах пліты-асновы ўмацаваны 4 чыгунныя гарматы. Помнік меў горадабудаўнічае значэнне: яго вертыкаль замыкала перспектыву Дварцовай вул. (сучаснай Савецкай).

Літ.: 1812 год: К 150-летию Отечественной войны: Сб. статей.— М., 1962; Бескровный Л. Г. Отечественная война 1812 года.— М., 1968; Корнейчик Е. И. Белорусский народ в Отечественной войне 1812 года.— Мн., 1962; Добровольский В. К. Витебская губерния в Отечественную войну.— Витебск, 1812; Минкус М., Пекарева Н., И. А. Фомин.— М., 1953; Грабарь И., И. А. Фомин.— Архитектура СССР, 1936, № 8.

М. К. Кошалеў, В. М. Чарнатаў.


79. ПОМНІК ГОРКАМУ Аляксею Максімавічу (гіст.). На вул. Горкага, каля дома № 25. Бюст А. М. Горкага ўстаноўлены ў 1952 г.

80. ПОМНІК КАЛІНІНУ Міхаілу Іванавічу (гіст.). На вул. М. Горкага, каля дома № 25. Бюст М. І. Калініна ўстаноўлены ў 1952.

81. ПОМНІК КАЛІНІНУ Міхаілу Іванавічу (гіст.). На тэрыторыі лакаматыўнага дэпо. Бюст М. І. Калініна ўстаноўлены ў 1976 г.



77. *Помнік вучням.*



78. *Помнік героям Айчыннай вайны 1812 г.*